...е да болю блізкія ягоныя успаміны, шкадаванні і пакаянні...

Мар'ян ДУКСА.

Пасылаў бы хоць некалькі слоў.
Мы ж так рэдка
маглі сустракацца.

# "СТАРАЮСЯ ЗАЗІРНУЦЬ У СВАЁ СЭРЦА..."

***Сваю юбілейную выставу "На хвалях часу", прысвечаную 60-годдзю з дня нараджэння, Уладзімір Церабун вырашыў ладзіць на малой радзіме. Своеасаблівы экзамен перад землякамі ён трымаў у светлы дзень праваслаўнага Вялікадня. Да іспыту адказна рыхтаваўся: закасаўшы рукавы, цэлы тыдзень афармляў выставу ў Смаргонскім гісторыка-краязнаўчым музеі, а перад яе адкрыццём сустрэўся са святым айцом і атрымаў благаславенне.***

Адкрыццё выставы наведалі людзі розных прафесій і заняткаў: заслужаны мастак Беларусі Мікола Апіёк і дырэктар Маладзечненскага музычнага вучылішча імя Агінскага Рыгор Сарока, паэт Уладзімір Някляеў і галоўны архітэктар раёна Васіль Тыцык, настаўнік-краязнавец Уладзімір Прыхач і хірург Юрый Чапёлкін, прадстаўнікі мясцовай улады, супрацоўнікі аддзела культуры, бібліятэкары, пенсіянеры і вучні школ, суседзі і проста знаёмыя... Трапна заўважыў на ўрачыстасці брат юбіляра Юрась: *"Валодзя, мы з табой багатыя на сяброў. І шчаслівыя, бо нас паважаюць людзі"*.



Уладзімір ЦЕРАБУН і яго работы.

Імя юбіляра для многіх асацыіруецца перш за ўсё з мемарыяльным комплексам "Дальва", за якую аўтар атрымаў прэмію Ленінскага камсамола Беларусі. Але ж Уладзімір Церабун – не толькі выдатны скульптар, ён майстар шматгранны. Ён правёў шэраг эксперыментаў у выкладцы з металу, у скульптуры з мазаікай, у кампазіцыях са шкла, керамікі і металу, круглай і рэльефнай скульптуры, пазней зацікавіўся графікай, акварэллю, алейным жывапісам. Напэўна, многія наведвальнікі пасля ўважлівага знаёмства з экспанатамі адкрылі для сябе новага Церабуна. Нават яго родны брат прызнаўся: *"Убачыўшы твой жывапіс, я зразумеў, чаму ты ганіш мой. Твой – выдатны"*.

Асабіста мне спадабалася арыгінальная кераміка – "жывыя" сасуды-скульптуры, "цёплы" драўляны дыпціх "Ясь і Яніна", а таксама серыя графічных малюнкаў "Ракурс". Выдатнае веданне анатоміі, валоданне тэхнікай малюнка аголенага цела, лёгкасць і эратычнасць – тое, што, на маю думку, збліжае гэтыя творы з работамі вядомага Рубенса.

*- Я ніколі не чакаю заказаў, не бяруся за тое, да чаго не ляжыць душа. Я заўсёды стараюся зазірнуць у сваё сэрца і зрабіць тое,*



*што сапраўды хачу*, - зазначыў творца.

Напэўна, у гэтым і заключаецца галоўны сакрэт сапраўднага майстэрства Уладзіміра Церабуна.

Пасля ўрачыстых віншаванняў майстар сам правёў першую экскурсію для прысутных - расказаў пра гісторыю стварэння сваіх твораў. Успомніў час, калі моцна захапіўся жывапісам і стварыў за тры месяцы 120 пейзажаў. Кампазіцыю "Крылатая", прысвечаную супрацоўнікам міліцыі, якія загінулі пры выкананні службовага і воінскага абавязкаў, і ўстаноўленую ў Гродне, Уладзімір Церабун ствараў разам з Аляксандрам Крахалёвым. Ідэя кампазіцыі так спадабалася абласному генералу міліцыі, што той нават вырашыў знайсці грошы, каб зрабіць яе не з медзі, як планавалася спачатку, а з больш каштоўнага сплаву – бронзы.

Прызнаўся Уладзімір Васільевіч, што доўга не мог адважыцца на стварэнне бюста нашага вядомага земляка дырыжора Віктара Роўды. Вельмі баяўся, што не справіцца з такой адказнай работай. І быў вельмі шчаслівы, што вынік працы задаволіў маэстра.

Расказаў аўтар падрабязна і пра скульптурныя кампазіцыі-праекты, над якімі цяпер працуе: "Дрэва жыцця" - для Вялікай Бераставіцы і "Слуцкія паясы" – для Слуцка. А яшчэ ён распрацаваў манументальны трыпціх, прысвечаны Адаму Міцкевічу.

Удзел у афармленні юбілейнай выставы прымала дачка майстра Наталля, камп'ютэрны дызайнер па адукацыі. Смаргонцам яна прапанавала сваю дыпломную працу, якая атрымала высокую адзнаку выкладчыкаў акадэміі мастацтваў, - серыю рэкламных плакатаў "Музыка", для эстрадна-сімфанічнага аркестра пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга.

Выстава прадоўжыцца да 15 чэрвеня і, безумоўна, зацікавіць шматлікіх яе наведвальнікаў. Потым яна "перакачуе" ў Гродна, а восенню ў сталіцу.

**Галіна АНТОНАВА.**
**Фота Міхася РАЗУМНІКА.**

